УДК 323.1(476) + 94(476) “1929/1939”

***Альховік Мікалай***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт,*
*Мінск, Беларусь*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА 1929-1939 ГГ. У БССР І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

У артыкуле разглядаецца эвалюцыя нацыянальнай палітыкі ў БССР у кантэксце развіцця беларускай савецкай дзяржаўнасці. Храналагічна артыкул ахоплівае 1929-1939 гг. – перыяд перагляду тэорыі і практыкі нацыянальнага будаўніцтва 1920-х гг. У артыкуле абгрунтоўваецца, што беларусізацыя спрыяла развіццю беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, а ў 1933-1939 гг. палітыка беларусізацыі была згорнута, што негатыўна паўплывала на нацыянальна-дзяржаўнае і культурнае развіццё БССР.

***Ключавыя словы: беларусізацыя, каранізацыя, нацыянальная палітыка, нацыянальныя меншасці***

Ключавымі прынцыпамі савецкай нацыянальнай палітыкі з’яўляліся «пралетарскі інтэрнацыяналізм» і права нацый на самавызначэнне. Апошняе падпарадкоўвалася «праву рабочага класа… на ўмацаванне сваёй улады,… на сваю дыктатуру» і не выключала магчымасці добраахвотнага аб’яднання нацый, стварэння абласной (тэрытарыяльнай) аўтаноміі [1, с. 15]. Пад нацыяй разумелася супольнасць людзей, якая гістарычна склалася і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры [2, с. 6-8]. У 1913 г. У.І. Ленін адзначаў: «Ёсць дзве нацыі ў кожнай сучаснай

нацыі…. Ёсць дзве нацыянальныя культуры ў кожнай нацыянальнай культуры». Ужо ў 1916 г. у яго работах з'явіўся тэрмін «сацыялістычная нацыя» [3, с. 35, 149]. Савецкая ўлада дэкларавала адмову ад «феадальна-буржуазнай» культуры і будаўніцтва сацыялістычнай культуры рабочага класа, бядняцка-серадняцкага сялянства і рабоча-сялянскай інтэлігенцыі на аснове рэвалюцыйна-дэмакратычных элементаў традыцыйнай народнай культуры. І.В. Сталін лічыў, што мова з'яўляецца агульнанароднай, надкласавай прыкметай нацыі і змяняецца на працягу вялікіх адрэзкаў часу [1, с. 5]. Роднай мовай лічылася найбольш зразумелая і даступная чалавеку размоўная мова, якую ён ужываў у побыце, у размовах з бліжэйшым акружэннем. Разам з тым да снежня 1933 г. частка дзяржаўных работнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі атаясамляла родную мову чалавека з мовай яго нацыянальнасці ці мовай продкаў [4, с. 124, 204, 238].

З першай паловы 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай палітыкі ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, якая заключалася ў абслугоўванні тытульнага насельніцтва на роднай мове, будаўніцтве беларускай пралетарскай культуры, вылучэнні беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады, узмацненні нацыянальнай самасвядомасці і забеспячэнні колькаснай перавагі беларусаў у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі [5, с. 27]. Палітыка беларусізацыі была накіравана на пераадоленне наступстваў русіфікацыі і трансфармацыю беларускай «буржуазнай» нацыі ў «сацыялістычную» [6, арк. 23-24].

Паводле Канстытуцыі БССР 1927 г. беларуская мова з'яўлялася пераважнай для зносін партыйных, дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый. Дзяржаўным служачым, членам КП(б)Б, ЛКСМБ, работнікам кааператываў прапаноўвалася карыстацца беларускай мовай у справаводстве, падчас публічных мерапрыемстваў, у размовах паміж сабой і з насельніцтвам, ведаць беларускую літаратуру, культуру, гісторыю і эканоміку БССР, гісторыю КП(б)Б і ЛКСМБ, улічваць умовы БССР, традыцыі і побыт беларусаў, рэагаваць на міжнацыянальныя канфлікты, выступленні супраць БССР, беларускай мовы і культуры і да т.п. Пераводу на беларускую мову падлягалі практычна ўсе дзяржаўныя інстытуты і грамадскія арганізацыі, у т.л. натарыяльныя і судовыя ўстановы, транспарт, ваенкаматы, вайсковыя шпіталі, беларускія аддзяленні выдавецтваў, банкаў і навучальных устаноў РСФСР, не выключаючы работнікаў з іншых рэспублік СССР. На беларускай мове выпускаліся дакументы масавага характару, бланкі, абвесткі, штампы, пячаткі, вывешваліся шыльды і надпісы [7, арк. 68]. Палітыка каранізацыі была накіравана на павелічэнне ліку беларусаў у

органах улады і кіравання, у асяроддзі інтэлігенцыі, у прадстаўніцтвах устаноў і арганізацый РСФСР у БССР.

У адпаведнасці з пастановамі ЦК ЛКСМБ «Аб правядзенні трохмесячніка беларускай пралетарскай культуры» (снежань 1929 г.), ЦК КП(б)Б «Аб нацыянальным пытанні» (25 кастрычніка 1930 г.), «Аб мерапрыемствах па ўзмацненні беларусізацыі» (красавік 1931 г.), сакратарыята ЦК КП(б)Б «Аб месячніку правядзення беларусізацыі» (ліпень 1931 г.), нацыянальнай камісіі ЦВК БССР «Аб практычным ажыццяўленні нацпалітыкі ў г. Воршы» (жнівень 1931 г.), ЦК і ЦКК КП(б)Б «Аб узмацненні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытанні» (21 снежня 1931 г.), Бюро ЦК ЛКСМБ «Аб задачах ЛКСМБ» (25 студзеня 1932 г.) і інш. Галоўным інструментам беларусізацыі сталі сацыялістычныя спаборніцтвы і ўдарніцтвы па ўжыванні беларускай мовы, рабоце з беларускай кнігай, палітбаі і палітдні па нацыянальным пытанні, месячнікі друку, месячнікі нацыянальнай палітыкі і г.д. Поспехі ў правядзенні беларусізацыі звязваліся з ліквідацыяй эксплуататарскіх класаў і ухілаў у бок нацыяналізму [8, с. 268].

Падчас гэтых палітыка-ідэалагічных і культурна-масавых кампаній і мерапрыемстваў ствараліся гарадскія і раённыя штабы беларусізацыі, тройкі, брыгады, праверачныя камісіі, якія вызначалі стан каранізацыі і абслугоўвання насельніцтва на роднай мове і г.д. [9, с. 32]. Праверкі нацыянальнай работы выявілі, што беларусізацыя ахапіла дакументазварот, рэгістратуру, выпіску і выданне газет, чытанне дакладаў і справаздач, афармленне шыльдаў і г.д. Падчас спрэчак на сходах і пасяджэннях, у прыватных гутарках і рабоце з наведвальнікамі большасць работнікаў пераходзіла на рускую мову. Так, у Слуцкім раёне дакументацыя вялася на беларускай мове, але толькі чвэрць супрацоўнікаў ужывала яе ў вуснай форме [10, арк. 70]. У 1930 г. у мэтах павышэння эфектыўнасці нацыянальнай работы былі створаны гарадскія і раённыя нацыянальныя камісіі, аднак яны сутыкнуліся з фактамі ігнаравання, фармальнага стаўлення да нацыянальнай палітыкі, адсутнасцю фінансавання і г.д. [11, арк. 13-15].

Ва ўсіх установах адукацыі і выхавання беларуская мова выкладалася ў якасці вучэбнага прадмета незалежна ад паходжання навучэнцаў [12, арк. 86]. Калі ў 1919 г. беларускія школы складалі 8%, у 1921 г. – 21,5%, у 1927/1928 – 1933/1934 нав.гг. іх доля вагалася ў межах 90%. Да 1922 г. каля 20% чатырохгодак былі пераведзены на беларускую мову, у 1924/1925 нав.г. – 28,4%, у 1925/1926 нав.г. – 79,6%, у 1926/1927 нав.г. – 85,3%, у 1928/1929 – 93,78%. У 1924/1925 нав.г. беларускія НСШ складалі 1,6%, у 1925/1926 нав.г. – 43,7%, у 1926/1927 нав.г. – 66,6%, у 1928/1929 нав.г. – 75%, 1930/1931 нав.г. –

73%. Была спынена практыка выкарыстання рускай і ўкраінскай моў у вучэбным працэсе і пазакласнай рабоце беларускіх школ [13, с. 111; 14, с. 639].

Істотных поспехаў дасягнула беларусізацыя вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, палітыка-асветных і культурна-асветных устаноў. Да 1928 г. былі беларусізаваны педагагічныя тэхнікумы і курсы. У 1925/1926 нав.г. беларусізацыя БДУ склала 14%, 1926/1927 – 31%, у 1927/1928 – 42,8%, у 1930/1931 нав.г. педагагічнага факультэта БДУ – звыш 90%, іншых факультэтаў БДУ – 75–80%, рабфака БДУ – 100%. У 1926/1927 нав.г. беларусізацыя ВНУ, ССНУ і ВТНУ дасягнула адзнакі 40%, 1930/1931 нав.г. – 50–60% [15, с. 16, 66]. Культурная рэвалюцыя спрыяла ўзмацненню попыту і прыкметнаму росту тыражоў друкаванай прадукцыі на беларускай мове. У 1932 г. на беларускай мове выдавалася 27 з 30 часопісаў, у 1933 г. – 259 з 293 газет, 90% кніжнай прадукцыі [16, с. 111; 17, с. 64-66; 18, с. 27-31].

Савецкая ўлада прытрымлівалася курсу на забеспячэнне дамінуючага становішча беларускай пралетарскай культуры ў БССР, аб чым сведчыла стварэнне беларускага аддзялення Цэнтральнага кіраўніцтва Дзяржаўнага аб'яднання музычных, эстрадных і цыркавых прадпрыемстваў (1930 г.), рэарганізацыя Тэатра рускай музычнай камедыі ў Тэатр музычнай камедыі БССР (1932), адкрыццё Беларускай студыі пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе (1933), прыкметны рост фонду кінакарцін на беларускай мове ў распараджэнні Белдзяржкіно і да т.п. [19, арк. 111].

У мэтах укаранення беларускай мовы ў паўсядзённае жыццё індустрыйных цэнтраў і ўцягнення рабочых у будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры прымаліся захады, накіраваныя на папулярызацыю «беларускай мовы, быту, культуры» сярод пралетарыяў з улікам нацыянальнасці, ведаў і гатоўнасці свядома і добраахвотна вывучаць і ўжываць беларускую мову. Да 1932 г. на беларускую мову былі пераведзены справаводства і культурна-масавая работа на прадпрыемствах. Руская мова дамінавала ў штодзённых зносінах прафесійных работнікаў, падчас нарад і пасяджэнняў [20, арк. 50; 21, арк. 54]. Павелічэнне ліку беларусаў у складзе гараджан было абумоўлена не толькі масавай міграцыяй сельскіх жыхароў, але і пераменамі ў нацыянальным самавызначэнні асобных пралетарыяў, якія ў 1926-1927 гг. запісваліся рускімі [22, арк. 189-190; 23, арк. 45].

У пастановах ЦК УКП(б) «Аб сельскагаспадарчых нарыхтоўках у Беларусі» ад 19 снежня 1932 г. І «Аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі УКП(б) у Беларусі» ад 2 сакавіка 1933 г. партыйна-савецкія

работнікі былі абвінавачаны ў ажыццяўленні «гвалтоўнай беларусізацыі». Забеспячэнне маральна-палітычнага адзінства савецкага грамадства прадугледжвала распаўсюджванне рускай мовы як другой роднай мовы, прапаганду савецкага патрыятызму, гісторыка-культурнай спадчыны рускага народа, спрадвечнай еднасці і «сталінскай» дружбы народаў СССР. У лістападзе 1936 г. права нацый на самавызначэнне было абмежавана, калі І.В. Сталін падчас прамовы «Аб праекце Канстытуцыі СССР» ускладніў крытэрыі стварэння саюзных рэспублік [24, арк. 179].

У Канстытуцыі БССР 1937 г. адсутнічала палажэнне пра асаблівы статус беларускай мовы. У 1938 г. Народны камісар асветы БССР У.І. Півавараў публічна заявіў, што «руская мова – гэта асноўная дзяржаўная мова», а беларуская мова і ідыш – «другарадныя» [25, арк. 250]. Барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам была спынена. У канцы 1930-х гг. работнікі і грамадскія актывісты былі вызвалены ад неабходнасці валодання беларускай мовай [26, арк. 369, 365], цэнтралізаваны перавод устаноў і арганізацый на беларускую мову быў абвешчаны антысавецкай работай, накіраванай на аслабленне пазіцый рускай мовы і культуры ў БССР [27, с. 78].

Успрыняўшы рашэнні ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б як сігнал аб згортванні беларусізацыі і асцерагаючыся абвінавачванняў у беларускім нацыяналізме, работнікі савецкіх устаноў, партыйных і грамадскіх арганізацый, ВНУ, ССНУ, ВТНУ, рабфакаў адмовіліся ад ужывання беларускай мовы. Так, студэнты Горацкага сельскагаспадарчага інстытута меркавалі: «хочаце, каб вас не звалі нацдэмамі, не вывучайце беларускай мовы» [28, арк. 113-115]. Установы адукацыі працавалі ва ўмовах адсутнасці сістэмы выкладання беларускай мовы і літаратуры. У сярэдзіне 1930-х гг. пачаўся несанкцыянаваны перавод беларускіх школ на рускую мову, у 1938-1939 гг. – афіцыйная рэарганізацыя беларускіх школ у рускія [29, арк. 179-180; 30, арк. 167, 172].

Савецкая ўлада адмовілася ад захавання дамінуючага становішча беларускай савецкай культуры ў БССР, аб чым сведчыла спроба закрыцця Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (1937-1938 гг.), ліквідацыя Гомельскага драматычнага беларускага тэатра (1937 г.), адсутнасць сістэмнай работы Белдзяржкіно па выпуску фільмаў на беларускай мове, заклікі да культурных дзеячаў арыентавацца на лепшыя ўзоры рускай культуры, рэпрэсіі супраць членаў беларускай секцыі ССП БССР. Калі ў 1933 г. Кніжная прадукцыя на беларускай мове склала 1102 друк. адз., то ў 1939 г. – 392 (у т.л. перакладная – 205) [31, арк. 10а; 25, арк. 114-117; 32, арк. 7-9 зв]. У канцы 1930-х гг. у масавым друку распаўсюджваецца паняцце «савецкі народ». Узнікла

пагроза асіміляцыі беларусаў, бо ўлады ў выпадку слабой нацыянальнай самаідэнтыфікацыі асобы вызначалі яе нацыянальнасць паводле размоўнай мовы і культурных арыентацый [33, арк. 260-308]. Падчас перапісу насельніцтва 1939 г. толькі 45,7% гараджан-беларусаў назвалі беларускую мову роднай (у 1926 г. – 50,3%) [34, с. 35-36].

Такім чынам, палітыка беларусізацыі ўмацоўвала пазіцыі беларускай мовы і беларускай пралетарскай культуры ў БССР, садзейнічала вылучэнню беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады і развіццю беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Згортванне беларусізацыі ў сярэдзіне – канцы 1930-х гг. стварыла рэальную небяспеку асіміляцыі тытульнага насельніцтва і аказала адмоўны ўплыў на нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларускай ССР.

1. Сталин, И.В. Марксизм и национально-колониальный вопрос / И.В. Сталин. – Москва : Партиздат ЦК ВКП(б), 1937. – 232 с.

2. Сталін, І.В. Марксізм і нацыянальнае пытанне / І.В. Сталін. – Менск : ДВБ, 1934. – 72 с.

3. Ленин, В.И. Вопросы национальной политики и пролетарского интернационализма : сборник / В.И. Ленин. – Москва : Госполитиздат, 1959. – 191 с.

4. Национальное образование в России: концепции, взгляды, мнения, 1905 – 1938 гг. : Сб. док. : в 2-х ч. – М. : ИНПО, 2002. – Ч. 2. – 312 с.

5. Майзель, Л. Десять лет борьбы и строительства / Л. Майзель, Ю. Шаповалов. – М. : Центриздат народов СССР. – Харьков. – Минск : 1930. – 45 с.

6. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6343.

7. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 126. – Воп. 1. – Спр. 8.

8. XIII зьезд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Стэн. справаздача. – Менск : БДВ, 1931. – 830 с.

9. Чарнецкі, Я. Перабудаваць работу, забясьпечыць тэмпы / Я. Чарнецкі // Комуністычнае выхаваньне. – 1930. – № 2. – С. 25-39.

10. НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 103.

11. НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 100.

12. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5475.

13. Вальфсон, С.Я. Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме ў нацыянальна-каланіяльным пытанні / С.Я. Вальфсон, І.М. Ільюшын. – Менск : БАН, 1935. – 145 с.

14. Дзесяты Ўсебеларускі зьезд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Стэн. Спр. – Менск : выданьне ЦВК БССР, 1931. – 760 с.

15. Дзесяць год Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. – Менск : Выд. Ўрад. Каміс., 1931. – 83 с.

16. БССР, 1922–1932. – Минск : Упр. народн. хоз. учета БССР, 1933. – 146 с.

17. Печать СССР в 1928, 1933 и 1934 гг. – Москва : изд-во «крестьянская газета», 1936. – 96 с.

18. Друк Беларускай ССР: 1918–1965 гг. – Мінск : Дзярж. К-тэт БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, 1967. – 91 с.
19. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6099.
20. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Фонд 5. – Воп. 1а. – Спр. 313.
21. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5013.
22. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7747.
23. НАРБ. – Фонд 265. – Воп. 1. – Спр. 2944.
24. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 14721.
25. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13225.
26. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12309.
27. Савецкая Беларусь. – Менск : ДВБ, 1938. – 92 с.
28. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7184.
29. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13233.
30. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13267.
31. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11021.
32. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13246.
33. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10870.
34. Асноўныя вынікі работы Ураду БССР: да перавыбараў Саветаў, 1928–29 г. – Менск : выданьне ЦВК і СНК БССР, 1928. – 150 с.

## NATIONAL POLICY IN THE BSSR IN 1929-1939 AND ITS INFLUENCE ON THE BELARUSIAN STATEHOOD DEVELOPMENT

***Mikalaj Aĺchovik***
*Belarusian State Medical University, Minsk, Belarus, alch0109@gmail.com*

The article deals with the national policy evolution in the context of the development of the Belarusian Soviet statehood. Chronologically, the article describes 1929-1939 - the period of the revision of the theory and practice of the nation-building of the 1920s. The article proves that the Belarusization contributed to the development of the Belarusian statehood on the Soviet basis. The policy of Belarusization has been minimized in 1933-1939, that had a negative impact on the BSSR national-state and cultural development.

***Keywords: Belarusization, indigenization, national politics, national minorities.***